ЭШС

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

7

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ВЫКА́ЗВАННЕ**, адзінка паведамлення, якая характарызуецца цэласнасцю сэнсу і ўспрымаецца ў пэўных камунікацыйных сітуацыях. Адрозніваюць наступныя тыпы В.:

1) паводле экспрэсіўнасці: а) нейтральныя (будуюцца на звычайным размяшчэнні кампанентаў актуальнага члянення: тэма — рэма; пазбаўлены эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі): *Белая гушчэча сняжынак / коса неслася долу...* (В. Быкаў); *А потым / прыляцеў надубны гаспадар* (Я. Брыль); *Восеньскія дзянькі / на дзіва ясныя, цёплыя...* (М. Капыловіч); б) экспрэсіўныя (праяўляецца праз адваротны парадак: рэма — тэма): *Ёсць у паэта / свой аблог цалінны* (А. Куляшоў); *Мяне навучыў марыць / лес* (І. Навуменка); *Кароткія яны, / гэтыя залатыя дзянькі бабінага лета* (Р. Ігнаценка);

2) паводле структуры: а) расчлянёныя (утрымліваюць тэму і рэму): *Плача хмара / без жалю, стогне вецер / без болю, ды не плача дзяўчына / без прычыны ніколі* (Максім Танк); б) нерасчлянёныя (з нулявой тэмай): *Імкнеміне час* (Т. Хадкевіч); *А вось і самая шырокая паляна* (М. Дзелянкоўскі); в) простыя (маюць адзін падзел на тэму і рэму): *Снег у тым годзе / сышоў рана* (Т. Хадкевіч); *Загадка ёсць у лёсе / амаль кожнага мастака* (М. Стральцоў); г) шматступеневыя (выяўляюць некалькі блокаў «тэма — рэма», як правіла, характэрны складаным сказам): *Зноў / пацяклі хвіліны ночы над ракой, але якая змена / адбылася вакол* (У. Караткевіч); *Вочы, вушы, сэрца, гарачая кроў / ёсць у звяроў, у птушак, у жывёл, а мара / — толькі ў аднаго чалавека* (І. Навуменка).

*М.С. Ржавуцкая.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ